Перспектыва працаваць на зямлі Вашчылу была не даспадобы. Да таго часу Расія стала на шлях мілітарызацыі — ужо з 1705 года дзейнічаў Указ аб рэкруцкай павіннасці, а "Соборное уложение" 1649 года канчаткова замацавала прыгоннае права. **І калі ў ВКЛ селянін мог (па жаданні) валодаць зямлёю і плаціць падаткі, ці не прымаць зямлі ў валоданне і не плаціць падаткаў, дык сяляне Расіі такога выбару не мелі.**

У Вашчылы было толькі дзве дарогі — альбо стаць рэкрутам у царскай арміі, альбо прыгонным, якога маглі прадаць, як жывёлу, забіць, не адказваючы за такі ўчынак. Такога дзікунства ў ВКЛ не ведалі. Згодна з артыкулам I раздзела XII Статута ВКЛ, шляхціц, забіўшы "...з суфальства, з опилства (пьяный) і без данья прычыны своволне, умысленае, легче поважаючы право посполітое, а паствечыся над створэннем божым... мясць быть горлом каран, кром головічізны", гэта значыць, пакараны смерцю акрамя штрафу.

Пажыўшы тры гады ў Расіі і зразумеўшы, што ў параўнанні з ВКЛ Расія — дзікунскі край, Вашчыла вырашыў вярнуцца ў ВКЛ. У 1737 годзе ён зноў з'явіўся на Крычаўшчыне, але ўжо не ў пана Сваткоўскага. Пустуючай зямлі на Крычаўшчыне ў той час было шмат, але Вашчыла не збіраўся прымаць яе ва ўладанне і працаваць на ёй. Ён знайшоў лёгкую справу — заняўся разбоем. І неўзабаве, ужо ў 1740 годзе, на Крычаўшчыне ўзнік першы ўзброены атрад, атаманам якога стаў Вашчыла.

Першая яго акцыя датычыла спынення працы на будах, якія былі асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі краю. Чаму Вашчыла перш за ўсё ўзяўся за буды? На іх разам з селянамі, якія адпрацоўвалі інвентарную павіннасць замест паншчыны, працавалі і наёмныя работнікі — буднікі, часцей за ўсё сяляне, якія не пажадалі браць у прыём зямлю.

Магістрат Крычаўскага староства абапіраўся на будаўнікоў, калі неабходна было ўсталяваць законную ўладу ў старостве. Менавіта з дапамогаю буднікаў у раёне Хоцімска быў разагнаны атрад паплечніка Вашчылы — Косці, а сам Косця ўзяты ў палон. Дарэчы, пазней Косця быў перададзены ў Расію, што пацвярджае, што ён, як і Вашчыла, быў перабежчыкам з Расіі.

(Заканчэнне на 4-ай стар.)

О чем говорят в России...

Амнистируют ли нелегальные миллионы?

Если у лидера российских коммунистов Геннадия Зюганова все-таки имеются подпольные зарубежные банковские счета с запрятанными на них "деньгами партии", он может радостно потирать руки. Ибо в самом скором времени эти деньги будет разрешено вполне легально вернуть в Россию. Власти страны готовятся к амнистии нелегального, в том числе нелегально вывезенного капитала — в правительстве заканчивается работа над проектом соответствующего закона.

Идею амнистировать нелегальный капитал обнародовал на заседании верхней палаты парламента — Совета Федерации, президент Борис Ельцин. Правда, говорил он лишь о капитале, спрятанном за рубежом. Схема предложена простая: желающие должны перевести в Россию и продекларировать сокрытые от властей денежные суммы, а также сообщить о нелегально приобретенной за рубежом недвижимости. И уплатить специальный льготный налог.

Автор законопроекта — главный мытарь страны (руководитель госналогслужбы) Александр Починок — настаивает на том, чтобы налог с утаенных денег был 10 процентов, а с имущества — 2 процента. После чего весь возвращенный капитал считается законной собственностью того, кто о нем объявил. Зарубежная недвижимость тоже объявляется вполне честной и законной.

Зачем это делается? Ответ прост: России нужны деньги, инвестиции. В коридорах власти считают, что на потайных зарубежных счетах россиян хранится не менее 100 миллиардов украденных у родины долларов. Эксперты полагают, что благодаря амнистии в страну может вернуться примерно треть этих денег.

Правительственные чиновники настроены еще более оптимистично. Первый заместитель руководителя госналогслужбы Евгений Бушмин возможные доходы государства от амнистии оценивает в 5 миллиардов долларов, то есть рассчитывает, что в страну вернутся 50 миллиардов долларов, из которых 10 процентов (5 миллиардов) поступят в казну в качестве налогов.

Эти 5 миллиардов долларов — главная надежда российского правительства, которому срочно потребовались новые источники пополнения федерального бюджета. Больше взять неоткуда. В текущем году исполнительная власть уже полностью провалила исполнение официального бюджета. Хуже того: хотя последние полгода Россия жила не по официальному, а по фактически секвестированному бюджету, правительство не может исполнить и его.

В начале осени доходы федерального бюджета начали резко снижаться: в августе поступило около 22 триллионов рублей, а в сентябре — всего лишь 17,6 триллиона. Дело в том, что в казну перестали поступать деньги от приватизации госсобственности. Впереди, правда, ожидаются новые распродажи, но до них еще надо дожить.

А денег уже сейчас требуется все больше и больше.

Долги по зарплате

Если в октябре минфин должен наскрести на погашение задолженностей по зарплате один дополнительный триллион рублей, то в ноябре — 3,6 триллиона, в декабре — 5,4 триллиона.

Правительству не впервой оставлять без зарплаты учителей, врачей и прочих бюджетников, включая армию и МВД. Но не исключено, что первый вице-премьер и министр финансов Анатолий Чубайс, поручившийся своим креслом за то, что нынче все федеральные долги по зарплате будут погашены, захочет данное слово сдержать. Законопроект предусматривает амнистию не только спрятанного за рубежом капитала, но и денег, укрытых в России. Нынешний уголовный кодекс гласит, что сокрытие доходов, налог с которых составляет свыше 200 минимальных зарплат (около 17 миллионов рублей, или примерно 3 тысячи долларов), карается штрафом от 3 до 7 тысяч долларов, или исправительными работами, или тюрьмой сроком до года. Сокрытие дохода, налог с которого превышает 500 минимальных зарплат, карается более крупным штрафом, а тюремный срок увеличивается до трех лет.

Налоговая амнистия, во-первых, позволяет избежать наказания. Во-вторых, при легализации ранее утаенного капитала виновнику позволяют изрядно сэкономить на самих налогах. Если его более честные коллеги платили налоговым органам 35 процентов от своих доходов, то амнистированным будет разрешено отдать родине в 3,5 раза меньше.

Амнистия позволит в революционно короткие сроки отмыть любые грязные деньги всем желающим. Правда, в законопроекте записано, что не подлежат легализации средства, полученные от торговли наркотиками или нелегальной торговли оружием, либо полученные иным криминальным путем. Есть даже специальный пункт о возможной проверке происхождения легализируемого капитала.

Дело это непростое

На практике следовать этому принципу будет весьма сложно, ибо у властей нет ни серьезного опыта в сложном деле, ни особого желания заниматься кропотливой проверкой "генеалогии" средств, кажущихся кому-то сомнительными.

Более того, в печати появились публикации о том, что возвращение нелегальных капиталов в легальную российскую экономику возможно лишь при обязательном условии. Оно таково: государство должно иметь к этому как можно меньше отношения.

Так, журнал "Коммерсант" предлагает возложить проведение амнистии на группу специально уполномоченных банков: "Банки должны будут гарантировать, что средства, переведенные на их специальные счета, не являются грязными — что за ними не стоят ни кровь, ни наркотики, ни рэкет". А государство должно будет "взять на себя обязательство безоговорочно верить предоставленной банком справке о легализации денег".

Можно себе представить, какой благодатной страной для бандитов всего мира станет Россия, позволяющая всего за 10 процентов легализовать практически любые капиталы, ибо поверить в 100-процентную честность российских банкиров трудновато. Источники из МВД неоднократно заявляли о сращивании бандитских и банковских структур, в результате чего не менее трети финансовых учреждений в той или иной степени подконтрольны криминальным группировкам.

Даже самый чистый коммерческий банк, которому сегодня тоже, как правило, очень не хватает свободных денег, вряд ли избежит соблазна легко и быстро преумножить контролируемые им капиталы.

Тот же "Коммерсант" признает, что, получив от правительства "карт-бланш", практически "любой уполномоченный на легализацию банк окажется перед выбором: либо блюсти свою репутацию, играя по строгим англо-саксонским правилам (имеется в виду принятая в 1990 году Советом Европы конвенция по борьбе с нелегальными доходами. — **Прим. ред.**), либо изменить в свою пользу эти правила, сделав выбор в пользу быстрого роста пассивов и активов".

Найдется немного

По оценкам экспертов, найдется весьма мало россиян, которые рискнут вернуть деньги на родину. Так, известный предприниматель, а ныне вице-спикер Госдумы Михаил Юрьев заявил прямо: "С чего это вдруг капиталы хлынут в Россию? Ради самих инвестиций? Прибыли? Абсурд! Деньги вывозились из страны не для получения более высокой прибыли там, а просто потому, что здесь их держать страшно — пропадут!"

И действительно, эффективность вложения денег в России выше, чем на Западе, однако и риск потерять все — тоже выше. Поэтому если домой и возвращаются российские деньги, то лишь в виде "иностранных инвестиций", чаще всего — под гарантии федеральной или местной власти. Под чужими, иностранными паспортами въезжают в Россию и многие ее бывшие граждане, в том числе владельцы этих самых вывезенных денег. Смысл их мимикрии один: защититься от произвола властей, получить хоть какую-то гарантию соблюдения своих прав. Ту гарантию, которой не имеет простой россиянин, не защищенный высокой должностью или депутатским мандатом.

Воровские "общаки"

Еще более пугающе выглядит такая мера в отношении внутренних нелегальных капиталов. В России сегодня немало воров в законе и прочих уголовных авторитетов, занявшихся, помимо криминального, еще и легальным бизнесом. Они ищут способы отмывания бандитского капитала. В случае внутренней амнистии государство рискует легализовать в том числе и воровские "общаки", в результате чего многие, по ком давно тюрьма плачет, словно по мановению волшебной палочки — всего за 10 процентов от награбленного, станут респектабельными состоятельными гражданами.

Законопроект об амнистии уже назначен к рассмотрению...

Александр ПРОЦЕНКО,
Москва.

Будут возить деньги

Американский бронированный автомобиль Литовского банка.

В Литовском банке при содействии германского бундесбанка оборудовано отвечающее международным стандартам хранилище. Если Литву примут в Евросоюз, здесь можно будет держать и евро.

Литовский банк позаботился и о перевозке ценных бумаг. Раньше для этого служил бронированный автомобиль марки КамАЗ, сейчас — новая бронемашина, которая приобретена в США. Ей не страшны ни взрывы, ни стрельба. Планируется купить еще одну.

Журналистов ознакомили еще с одним новшеством — голландским аппаратом для уничтожения износившихся денег. Два таких же агрегата недавно приобрел и центральный банк Англии. Негодные литы уничтожают в одном из надежно охраняемых помещений банка. Аппарат разрезает банкноты на мелкие части. Отходы прессуют в брикеты.

В Голландии отходы своей валюты сжигают. Американцы делают из потрепанных долларов карандаши. В Литве денежных отходов слишком мало, чтобы наладить из них какое-то производство. Даже немцы из своих старых марок тоже ничего не делают.

ЭЛЬТА.



Народная Воля
13 ЛІСТАПАДА 1997 г.

Старонкі гісторыі

Дык хто ён, Васіль Вашчыла – нацыянальны герой Беларусі ці забойца?

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

У кніжцы, якую падрыхтаваў Мялешка, войтамі называюцца Вашчыла і Косця, першы — вёскі Селішчы, другі — вёскі Бярозка. Але ці маглі яны быць адміністрацыйнымі службовымі асобамі ВКЛ? Згодна са Статутам ВКЛ, войтам мог быць выбраны селянін, які прыняў у карыстанне валоку зямлі і меў цэнз аседласці менш за 5 год. Ні Вашчыла, ні Косця не адпавядалі гэтым патрабаванням, таму легітымна не маглі быць выбраны на гэту пасаду. Магчыма, яны сябе і называлі войтамі, але хто можа забараніць называцца хоць бы каралямі ці імператарамі. Надаў жа Вашчыла сабе пазней тытул "унука Багдана Хмяльніцкага".

У маі 1740 года Вашчыла са сваім атрадам напаў на буду каля вёскі Самацэвічы, разагнаў буднікаў і службовых асоб. Праз некалькі дзён тое ж здарылася і з Бохнаўскай будай, дзе атрад Вашчылы ледзь не забіў адміністратара Янкоўскага. Вашчыла забараніў магістрату Крычаўскага староства наймаць на буды новых работнікаў альбо дапускаць працаваўшых раней.

Былі спробы знішчыць і буды па вырабе паташу. Якая карысць была ад такой "дзейнасці" гэтых, названых Мялешкам, "барацьбітоў за інтарэсы працоўных" тым жа буднікам, якія пасля нападу банды Вашчылы страчвалі працу?

Другой справай, за якую ўзяўся гэты "абаронца", была здача ў арэнду чужой маёмасці. Звыш дваццаці арэндных дамоваў было выдадзена Вашчылам толькі з канца 1740 па чэрвень 1741 года.

Напрыклад, дамова з Віскоўскім на арэнду карчмы, млына і фолюша тэрмінам на адзін год у вёсцы Брацькавічы за 1000 злотых. Пры гэтым Вашчыла, Стэсь Бачко, Іван Карнач паведамлялі тым, каму выдавалі арэндную дамову, што дзейнічаюць ад імя Радзівіла.

Неўзабаве Вашчыла прыдбаў маёнтак у вёсцы, што паблізу цяперашняга Краснаполля, і можна сцвярджаць, што за нарабаваныя грошы. Прайшло толькі тры гады, як ён прыйшоў з-за рускай мяжы ў адным кажуху.

Калі ў верасні 1740 года Радзівіл накіраваў у крычаўскія войтаўствы сваю даверяную асобу Гінтаўта, каб той высветліў абставіны майскіх разбояў, дык Вашчыла адмовіўся ад сустрэчы з Гінтаўтам па наступной прычыне: "Грошай гібернавых у мяне няма, і таму баюся трапіць у турму" (гіберна — палатак на ўтрыманне войска). А тыя грошы гібернавыя, якія Вашчыла збіраў нібыта ад імя Радзівіла, ён патраціў на набыццё маёнтка ў Казеллі.

Чаму ж Вашчыла не быў арыштаваны Крычаўскім магістратам? Адказ можна знайсці ў лісце службовай асобы Керсноўскага да Гераніма Радзівіла за красавік 1741 года. Керсноўскі паведамляў, што ў атрады Вашчылы ідуць розныя лёзныя (без заняткаў) людзі з іншых уладанняў, а таксама з-за рускай мяжы. Вашчылаўскія банды знаходзяцца паблізу рускай мяжы.

Сам жа Вашчыла ўдзень знаходзіцца ў межах ВКЛ, у раёне Хоцімска, а на ноч адыходзіць на тэрыторыю рускай дзяржавы. Паміж Вашчылам і рускім межавым фарпостам існуюць цесныя сувязі. Менавіта такая падтрымка дазваляла Вашчыле смялей і з большай нахрапістасцю дзейнічаць у памежнай зоне, павялічваць свае банды перабежчыкамі з Расіі.

Банды Вашчылы, Васіля Ветра, Івана Дакукі, дарэчы, як і банды Івана Карнача і Стэся Бачко, перабежчыкаў з Расіі; актыўна падтрымлівала мясцовая дробнапамесная шляхта Крычаўшчыны і суседніх мясцін. Пры вашчылаўшчыне кантроль Крычаўскага магістрата адсутнічаў, законы ВКЛ не выконваліся, а мясцовыя шляхціцы значна пашырылі свае ўладанні за кошт зямель, якімі юрыдычна валодаў Геранім Радзівіл.

Прыезд праваючых, якіх час ад часу накіроўваў Радзівіл у свае ўладанні, нічога добрага мясцовай шляхце не абяцаў. Заўсёды ў час рэвізіі выкрываліся незаконна прыбраныя землі і дробныя шляхціцы заставаліся без неабкладаемай падаткам крыніцы даходаў.

Крыштоф Валовіч і Марцін Цеханавецкі былі неафіцыйнымі дырыжорамі ў барацьбе з Геранімам Радзівілам. Менавіта яны, найбольш уплывовыя ўладальнікі, распаўсюджвалі чуткі, што галоўны касір Гдаль Іцкавіч збірае войска Радзівіла і мае намер ісці на Крычаўшчыну, каб знішчыць усіх падданых, іх жонак і дзяцей. А на месцы спустошанага ўладання стварыць затым новыя пасяленні з прышлых людзей. І калі такія чуткі разносіў не абы хто, а сам шляхціц Валовіч, людзі верылі ім. Не апошнюю ролю адыгрывала і мясцовая шляхта. Крыштоф Валовіч падтрымліваў Івана Карнача і Вашчылу, Марцін Цеханавецкі — Стэся Бачко. Напрыклад, Вашчыла заўсёды меў пры сабе атрад у дзвесце коннікаў са зброяй. Для падтрымкі банд Вашчылы і Карнача пры захопе крычаўскага замка той жа Цеханавецкі накіраваў вайсковы атрад са зброяй. Агульным імкненнем мясцовай шляхты было стаць гаспадарамі ў Крычаўскім старостве. Па задуме найбольш магутнага са шляхціцаў Валовіча, бунты на Крычаўшчыне павінны былі прынудзіць яшчэ маладога Гераніма Радзівіла альбо зусім адмовіцца ад валодання пяццю войтаўствамі, альбо аддаць іх у арэнду. Кожны марыў стаць уладальнікам войтаўстваў, кожны абяцаў кіраўнікам бунтаў падтрымку, але найбольшыя шанцы былі ў Валовіча.

Напрыклад, пры сустрэчы з Вашчылам, Ветрам і Карпачом у ліпені 1743 года ў вёсцы Коханаўка Валовіч абяцаў, што зробіць усё, каб стаць гаспадаром Крычаўшчыны, што калі не ў Радзівіла, дык у самога караля Рэчы Паспалітай, але даб'ецца арэнды войтаўстваў.

У другой палове 1743 года Геранім Радзівіл накіраваў у Крычаў даверяных асоб, каб правесці рэвізію сваіх войтаўстваў. Пры гэтым адразу б высветлілася, хто з сялян больш ужо не мае льготаў па падаткаабкладанні, хто карыстаецца зямлёй без прыёму яе ў карыстанне, хто з мясцовых шляхціцаў прысвоіў землі, юрыдычную ўласнасць Гераніма Радзівіла і не плаціў у скарб (бюджэт ВКЛ) падатку. Гэтае разумнае ў дадзеным выпадку рашэнне Гераніма напалохала як мясцовую шляхту, прышлых сялян-слабаджан, так і кіраўнікоў бунтаў. Менавіта пасля гэтага рашэння Гераніма Радзівіла мясцовая шляхта на чале з Валовічам узмацніла падтрымку Вашчылы і іншых. Узброеныя ж банды Вашчылы нападалі на дамы купцоў і іншых заможных людзей Крычава і рабавалі іх. Так, у канцы 1743 — пачатку 1744 года банды разагналі Крычаўскі магістрат — органы самакіравання староствам перасталі дзейнічаць. Дзяржаўнае войска ВКЛ не здолела стлуміць банды Вашчылы і ўсталяваць законны парадак у старостве. Гэты поспех надаў Вашчыле ўпэўненасці. Ён вырашыў, што перашкод да захопу ўсёй улады ў ВКЛ больш не існуе.

Вашчыла выдае "маніфэст", у якім абвяшчае сябе... унукам Б.Хмяльніцкага, гетманам войскаў на абароне хрысціянства і знішчэнні "народу жыдоўскага". Уплыў відавочны. Менавіта ў Расіі заўсёды лічылі, што ва ўсіх цяжкасцях павінны яўрэі. Гэта адпавядала думкам войска Вашчылы, якое ў асноўным было з перабежчыкаў. А тое, што ён абвяшчае сябе "ўнукам" Б.Хмяльніцкага, надавала нейкую легітымнасць па захопу ўлады ў ВКЛ. Мажліва, Вашчыла разлічваў і на падтрымку з боку Расіі.

У "маніфэсце" Вашчылы адзначалася, што галоўны атрад на чале з ім мае намер ісці на Вільню. Другі атрад на чале з "палкоўнікам" Харком будзе рухацца ў напрамку да Барысава, а трэці атрад на чале з "маёрам" Анціпка — на Брэст. Каб нейтралізаваць шляхту іншых старостваў, Вашчыла ў сваім "маніфэсце" абяцаў, што яго атрады не будуць рабаваць іх маёнткі.

Праз "маніфэст" Вашчыла запрашаў усіх жадаючых прыняць удзел у гэтым паходзе, абяцаючы добра заплаціць і не забыцца на кожнага пасля паспяховага ўзяцця ўлады ў ВКЛ у свае рукі. Аб гэтым "маніфэсце" Вашчылы паведаміў Геранім Радзівілу камісар ВКЛ Т.Агінскі, які ў пачатку 1744 года быў у Крычаўскім старостве.

Пасыльны, што дасылаў ліст Агінскага Радзівілу, загнаў двух коней. Пасля знаёмства з гэтым лістом Геранім зразумеў, што ў Крычаўскім старостве разгортваюцца падзеі, вынікі якіх могуць быць трагічнымі, а таму марудзіць больш недаравальна. Становішча ў ВКЛ у той час было такім, што план Вашчылы па захопу ўлады ў ВКЛ мог здзейсніцца. Геранім Радзівіл прыняў адзінае магчымае рашэнне — усталяваць законную ўладу ў старостве з дапамогаю свайго прыватнага войска. І 15 студзеня 1744 года яго атрад — 260 жаўнераў — увайшоў у Крычаў.

Трыбунал ВКЛ накіраваў 70 жаўнераў з чатырма гарматамі на дапамогу войску Радзівіла. Гэты атрад рухаўся з Невеля і Себежа і пасля злучэння ў Крычаве з войскам Радзівіла, аб'яднаны, павінен быў разбіць вашчылаўшчыну.

Трэба адзначыць, што гэта было рызыкоўнае рашэнне. Вашчыла мог знішчыць атрад Радзівіла, а затым і атрад дапамогі. Пасля такога поспеху ўжо больш нічога не перашкодзіла б яму на шляху да Вільні. Уражвае, што ў такіх незвычайных абставінах Геранім Радзівіл не пакідаў надзеі не дапусціць крывапраліцця і ўсталяваць законную ўладу мірным шляхам. Камандуючы атрадам палкоўнік Пястжэцкі меў загад выкарыстаць усе магчымыя сродкі для мірнага вырашэння канфлікту.

Пасля прыбыцця ў Крычаў палкоўнік адразу ж распаўсюдзіў "універсал-зварот" Радзівіла да насельніцтва староства, дзе той заклікаў сваіх падданых не ўдзельнічаць у вашчылаўскіх бандах, вырашыць усе спрэчныя пытанні з яго даверанымі асобамі і з ім асабіста. Адначасова палкоўнік Пястжэцкі накіраваў усім войтам запрашэнні прыбыць у Крычаў для абмеркавання спрэчных спраў.

Вашчыла добра разумеў, што мясцовым сялянам даўно абрыдла двойчы плаціць падаткі, спачатку Вашчыле, а потым Радзівілу, што мясцовыя сяляне гатовы пакінуць яго войска. Усталяванне законнай улады ў старостве было для Вашчылы канцом. Вашчыла з паплечнікамі вырашылі першымі напасці на атрад палкоўніка Пястжэцкага. Калі б ім удалося перамагчы, то невялічкі атрад з Невеля разбіць было б нескладана. І вось 18 студзеня, пасля трох дзён знаходжання атрада Пястжэцкага ў Крычаве, Вашчыла напаў на атрад. Але адна справа — рабаваць мірных жыхароў, другая — уступіць у бойку з добра арганізаваным і вывучаным войскам Гераніма Радзівіла.

Нягледзячы на колькасную перавагу бунтаўшчыкоў над атрадам палкоўніка Пястжэцкага, напад Вашчылы быў адбіты, а рэшткі яго банды адкінуты ад Крычава. Пагроза падыходзячаму атраду Цялецкага знікла. Месцам дыслакацыі банд Вашчылы стала вёска Царковішча, што каля самай мяжы з Расіяй. Амаль што ўсё староства было свабодна ад вашчылаўцаў. Зноў пачаў дзейнічаць магістрат Крычава. Палкоўнік Пястжэцкі неаднаразова звяртаўся да тых, хто застаўся ў вёсцы Царковішча, накіроўваў туды бурмістраў і папоў. Усе гэтыя захады Пястжэцкага далі свой плён. Усе, хто быў пад прымусам далучаны да банд Вашчылы ці ашуканы агітацыяй Крыштофа Валовіча, пакінулі Царковішча.

Зразумела і мясцовая шляхта, што падтрымліваць Вашчылу цяпер небяспечна. Нарэшце падышоў атрад Цялецкага. Цяпер ужо Пястжэцкі вырашыў канчаткова стлуміць вашчылаўшчыну. У ноч на 26 студзеня атрад Пястжэцкага рушыў у напрамку Царковішча і, калі пачало віднець, атакаваў лагер. Паплечнікі Вашчылы не здолелі арганізаваць аніякай абароны. Сам жа "ўнук Хмяльніцкага" збег пад час бою ў свой маёнтак Казелле, а адтуль праз Латакоўскі межавы фарпост — у Расію.

Вось чаму на Магілёўшчыне шырока распаўсюджана прыказка "даць латакі" — гэта значыць уцякаць, кінуўшы ўсё. Пры дапамозе мясцовага насельніцтва амаль усе ўдзельнікі вашчылаўшчыны былі схоплены. У поўнай адпаведнасці з раздзелам XI Статута ВКЛ і шэрагу артыкулаў гэтага раздзела, а таксама артыкула 3 раздзела I былі асуджаны да пакарання смерцю толькі найбольш актыўныя ўдзельнікі бунтаў, усяго толькі 16 чалавек.

В.Мялешка ў сваёй кніжцы ўпарта стварэў вобраз Гераніма Радзівіла як жорсткага, крыважаднага чалавека. Але факты, у тым ліку і прыведзеныя ў самой кніжцы, гавораць аб адваротным. З якой упартасцю Геранім дамагаўся мірнага стлумлення бунту!

У 15 паплечнікаў Вашчылы, якім па прысуду павінны былі адрэзаць па адным вуху, па просьбе Гераніма была адменена гэта мера пакарання. Але ён настаяў, каб сыну аднаго з найбольш актыўных кіраўнікоў бунтаў Стэся Бачко, які быў пісарам у непісьменнага Вашчылы і складаў "маніфэст", адрэзалі абодва вухі.

Мялешка адмаўляе існаванне "маніфэсту" Вашчылы. У якасці аргументаў ён прыводзіць адмову таго ад самазванства на допыце. І другі аргумент, што Геранім Радзівіл у сваім абвінавачым лісце не адзначае пра гэта самазванства. У Гераніма было столькі цяжкіх абвінавачанняў да Вашчылы, што новыя былі проста непатрэбныя.

І чаму В.І.Мялешка больш давярае адмове самога Вашчылы, чым паведамленню камісара ВКЛ Т.Агінскага, які адзначыў гэты факт у сваім лісце? Ды і пісар Вашчылы, сын Стэся Бачко, на допыце пацвердзіў існаванне "маніфэста" Вашчылы.

Пасля ўсталявання законнай улады на Крычаўшчыне сам Вашчыла ўжо не ўяўляў ні для каго аніякага інтарэсу. Улады ВКЛ звярнуліся ў Міністэрства замежных спраў Расіі з просьбай выдаць злачынцу Вашчылу для суда над ім. Геранім Радзівіл быў зацікаўлены, каб улады Расіі перадалі Вашчылу, бо тады з'явілася б магчымасць устанавіць, што Крыштоф Валовіч мае дачыненне да бунту як галоўны падбухторшчык.

Калегія замежных спраў Расіі ў сваім адказе трыбуналу ВКЛ за подпісам графа Бястужава-Руміна знайшла, што "...абвінавачанні супраць яго (Вашчылы) настолькі сур'ёзныя, што заслугоўвае ён суровага пакарання". І далей: "...Яе імператарская Вялікасць не прыхільна патураць падобным самавольствам". Такім чынам, дзеянні Вашчылы былі асуджаны нават афіцыйным урадам Расіі, які ніколі не меў цёплых адносін да ВКЛ.

Хутчэй за ўсё Вашчыла быў бы перададзены ўладам ВКЛ. Але незадоўга да вырашэння пытання аб перадачы ён памёр ад мыту (дызентэрыі) у астрозе.

Дарэчы, у адной з радыёперадач аб подзвігах Вашчылы з'явілася новая хлусня, нібыта Вашчылу атруцілі служкі Радзівіла. Каму з такім замілаваннем неабходна паўтараць аб "подзвігах" Вашчылы?

Вашчыла за свае злачынствы атрымаў сабе прысуд, ён застаўся ў гістарычным нябыце. І толькі прыказка "даць латакі" засталася ў памяці народа. Можа, і не трэба было б марнаваць час на пошукі гістарычнай праўды аб Вашчыле, але вельмі небяспечная з'ява, калі забойца і гвалтоўнік з'яўляецца да нас у ролі нацыянальнага героя і барацьбіта за інтарэсы працоўных.

РАСКЛАД РУХУ ПРЫГАРАДНЫХ ЦЯГНІКОЎ З 1 ЛІСТАПАДА 1997 ГОДА

Маршрут	Адпр.	Дні	Прыпынкі
МІНСК — БАРАНАВІЧЫ			
Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі			
Баранавічы	04-22	штодзён.	б/п 822 км
Стоўбцы	05-49	штодзён.	усюды
Стоўбцы	06-40	штодзён.	усюды
Баранавічы	7-18	пт., вых.	б/п 822 км
Стоўбцы	07-50	штодзён.	усюды
Баранавічы	08-20	штодзён.	б/п 822 км
Стоўбцы	08-54	вых.	б/п Мезінаўка, Атцэда, 822 км
Баранавічы	11-30	вых.	б/п 822 км
Брэст	13-11	штодзён.	б/п Пціч, Волчкавічы, Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына, 806 км, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, 822 км
Стоўбцы	13-41	штодзён.	б/п 822 км
Баранавічы	14-13	штодзён.	б/п Станькава, Мезінаўка, Атцэда, 822 км
Стоўбцы	17-32	штодзён.	б/п 822 км
Стоўбцы	18-22	штодзён.	б/п 822 км
Брэст	19-12	штодзён.	б/п 822 км
Баранавічы	20-20	штодзён.	б/п 822 км
Адпраўленне з прыпыначнага пункта "Інстытут Культуры"			
Брэст	00-50	штодзён.	да ст. Памыслішча – усюды, далей з прыпынкамі па станцыях
Стоўбцы	09-15	штодзён.	б/п 822 км
Стоўбцы	09-39	вых.	б/п 822 км
Брэст	10-30	штодзён.	б/п 822 км
Стоўбцы	10-52	вых.	б/п 822 км
Стоўбцы	12-12	вых.	б/п 822 км
Стоўбцы	12-48	штодзён.	б/п 822 км
Гарадзея	14-40	пт., вых.	б/п 822 км
Стоўбцы	15-25	штодзён.	б/п 822 км
Баранавічы	16-09	штодзён.	б/п 822 км
Баранавічы	16-59	штодзён.	б/п Гай, Пціч, Станькава, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сінява, 822 км
Баранавічы	21-12	штодзён.	да ст. Стоўбцы – усюды, акрамя прып. 822 км, далей – па станцыях
Стоўбцы	22-42	штодзён.	б/п 806 км, Мезінаўка, 822 км
МІНСК — ОРША			
Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі			
Барысаў	04-36	штодзён.	з прып. па ст. і п. п. Трактарны, Зарэчнае, Жодзіна-Паўдн., Печынскі
Адпраўленне са станцыі Мінск-Усходні			
Орша	09-17	вых.	б/п Садовы, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пр. Перамога, Беразіна, Неманіца, Замужанне, Бережок, Красноўка, Траціпава, Чырв. Горка
Талачын	09-58	вых.	б/п Загор'е, Барсукі, Пр. Перамога
Адпраўленне з прыпыначнага пункта "Інстытут культуры"			
Орша	01-06	штодзён.	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пр. Перамога
Крупкі	05-13	штодзён.	б/п Садовы
Орша	06-31	штодзён.	усюды
Крупкі	07-18	штодзён.	усюды
Барысаў	08-11	штодзён.	усюды
Барысаў	08-42	рабоч.	усюды
Слаўнае	08-42	вых.	усюды
Барысаў	10-11	вых.	усюды
Орша	10-58	штодзён.	усюды
Барысаў	11-54	рабоч.	усюды
Прыяміна	11-54	вых.	усюды
Барысаў	12-32	пт., вых.	усюды
Орша	13-14	штодзён.	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пр. Перамога, Неманіца, Замужанне, Красноўка, Перавалачны, Гапащаеўка
Крупкі	13-36	рабоч.	усюды
Барысаў	13-36	вых.	усюды
Барысаў	14-23	штодзён.	б/п Садовы
Орша	15-05	штодзён.	б/п Загор'е, Барсукі
Бобр	15-40	штодзён.	б/п Дамашаны
		з 3/XI	
Жодзіна	*16-29*	*штодзён.*	*б/п Садовы*
Барысаў	17-02	штодзён.	усюды
Крупкі	17-48	штодзён.	усюды
Орша	18-27	штодзён.	б/п Садовы, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пр. Перамога
Барысаў	19-09	штодзён.	усюды
Барысаў	20-26	штодзён.	б/п Садовы
		з 3/XI	
Барысаў	*21-53*	*штодзён.*	*усюды*
Барысаў	*22-54*	*штодзён.*	*б/п Дамашаны*
Орша	*22-54*	*пт.*	*б/п Дамашаны да ст. Барысаў, далей з прыпынкамі па станцыях*
МІНСК — МАЛАДЗЕЧНА			
Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі			
Беларусь	0-31	штодзён.	б/п Лебядзіны
Маладзечна	04-18	штодзён.	б/п Лебядзіны, М. Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі
Маладзечна	05-14	штодзён.	Лебядзіны
Аляхновічы	06-06	штодзён.	па панядз. б/п Лебядзіны
Маладзечна	06-35	штодзён.	б/п Лебядзіны, Зялёнае, Анусіна, Вязынка, Баяры, Мясота, Татаршчызна, па панядз. б/п Лебядзіны
Маладзечна	06-48	штодзён.	б/п Крыжоўка, Хмелеўка, Пралескі, Раманы, Ласі, Селівонаўка
Маладзечна	07-37	штодзён.	усюды
Аляхновічы	07-58	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	08-15	штодзён.	усюды
Аляхновічы	08-48	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	09-00	штодзён.	па панядз. Лебядзіны
Аляхновічы	09-19	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	09-42	па вых. і свят.	б/п Хмелеўка, Раманы, Ласі, Селівонаўка
Маладзечна	09-54	штодзён.	па панядз. б/п Лебядзіны
Аляхновічы	10-17	па вых. і свят.	усюды
Аляхновічы	10-50	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	11-04	штодзён.	па панядз. б/п Лебядзіны
Аляхновічы	11-36	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	12-00	штодзён.	усюды
Аляхновічы	12-32	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	12-56	штодзён.	па панядз. б/п Лебядзіны
Аляхновічы	13-24	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	13-39	штодзён.	усюды, па панядз. б/п Лебядзіны
Аляхновічы	14-31	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	15-00	вых, свят., пт.	б/п М. Мора, Хмелеўка, Анусіна, Раманы
Аляхновічы	15-22	штодзён.	усюды
Маладзечна	15-37	штодзён.	усюды, па панядз. б/п Лебядзіны
Аляхновічы	15-50	па вых. і свят.	усюды
Маладзечна	16-15	штодзён.	усюды
Аляхновічы	16-29	вых., свят., пт.	усюды
Маладзечна	16-55	штодзён.	усюды
Маладзечна	17-41	штодзён.	усюды
Маладзечна	18-29	штодзён.	усюды, па панядз. б/п Лебядзіны
Маладзечна	19-14	штодзён.	усюды
Маладзечна	20-24	штодзён.	усюды
Маладзечна	21-14	штодзён.	б/п Селівонаўка, Лебядзіны
Маладзечна	22-15	штодзён.	Лебядзіны
МІНСК — АСІПОВІЧЫ-1			
Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі			
Асіповічы	0-29	штодзён.	да ст. Рудзенск – усюды, далей з прыпынкамі па станц.
Асіповічы	04-54	штодзён.	б/п Весялоўскі
Асіповічы	06-02	штодзён.	усюды
Асіповічы	06-57	штодзён.	усюды
Асіповічы	07-56	штодзён.	усюды
Пухавічы	08-10	па вых. і свят.	б/п Нов. Сяло
Асіповічы	08-32	штодзён.	б/п Вярхі
Асіповічы	09-09	штодзён.	усюды
Асіповічы	09-54	па вых. і свят.	б/п Зазерка, Вендзеж, Веленскі
Талька	10-19	па вых. і свят.	усюды
Асіповічы	10-41	па вых. і свят.	усюды
Асіповічы	11-30	штодзён.	усюды
Асіповічы	12-23	штодзён.	б/п Весялоўскі, Вярхі
Асіповічы	13-11	штодзён.	усюды
Талька	13-52	па вых. і свят.	усюды
Асіповічы	14-08	штодзён.	усюды
Талька	14-47	вых., свят., пт.	
Асіповічы	15-18	штодзён.	усюды
Талька	16-23	штодзён.	б/п Зазерка, Вендзеж
Асіповічы	16-50	штодзён.	усюды
Асіповічы	17.37	штодзён.	усюды
Талька	18-19	вых., свят., пт.	б/п Зазерка
Асіповічы	18-41	штодзён.	усюды
Талька	19-35	штодзён.	усюды
Асіповічы	20-37	штодзён.	усюды
Асіповічы	22-16	штодзён.	б/п Вендзеж, Веленскі, Весялоўскі, Вярхі, Савецкі

Скарачэнні:

б/п . . . . . *без прыпынкаў*
вых. . . . . . *выхадныя*
свят. . . . . . *святочныя дні*
рабоч. . . . . . *рабочыя дні*
пт. . . . . . *пятніца*
штодзён. . . . . . *штодзённа*
ст. . . . . . *станцыя*
п. п. . . . . . *прыпыначны пункт*

Дзень у гісторыі

13 лістапада

■ У 1745 г. нарадзіўся французскі педагог **Валянцін Гаюі**, які заснаваў у Парыжы першы ў свеце інтэрнат для сляпых людзей. Ён выступаў за далучэнне сляпых да грамадска-карысной працы, за прызнанне іх паўнацэннымі адзінкамі грамадства. Штогод дзень нараджэнне гэтага выдатнага педагога цяпер адзначаецца як Міжнародны дзень сляпых.

■ У 1850 г. у Шатландыі ў сям'і марскога інжынера нарадзіўся **Роберт Льюіс Стывенсан**, англійскі пісьменнік, аўтар раманаў "Вострай скарбаў" і "Чорная страла". Між іншым, юрыст па адукацыі...

■ У 1852 г. памёр **Іван Іванавіч Грыгаровіч**, беларускі гісторык, археолаг, краязнавец і мовавед. Шмат гадоў ён збіраў матэрыялы ў архівах Мсціслаўля і Магілёва для напісання палітычнай і царкоўнай гісторыі Беларусі "Беларуская іерархія". Атрымаў духоўную адукацыю ў Магілёве і Пецярбургу. Быў рэктарам Гомельскага духоўнага вучылішча.

■ У 1897 г. нарадзіўся **Аркадзь Аркадзьеў** (сапраўднае прозвішча Цівунчык), беларускі акцёр і рэжысёр. Ён стварыў у Бабруйску вандроўны беларускі драматычны тэатр.

■ У 1916 г. у Петраградзе быў заснаваны беларускі часопіс "Светач" (рэдактар Э.Будзька). На жаль, выдаваўся ён нядоўга — да 13 студзеня 1917 г.

■ У 1918 г. у гэты дзень быў анулявані **Брэсцкі мірны дагавор**, заключаны паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блоку ў сакавіку 1918 г.

■ У 1944 г. **урад Бельгіі** прыняў рашэнне аб раззбраенні ўсіх арганізацый народнага руху Супраціўлення. Праз дзень пасля прыняцця гэтага рашэння прадстаўнікі камуністычнай партыі ў знак пратэсту выйшлі з урада Бельгіі.

Старонкі храналогій гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

Стоп-кадр

"Белая вежа" в Бресте. Гран-при гомельской "Чайке"

Гран-при Международного театрального фестиваля "Белая вежа" в Бресте актриса Гомельского областного драматического театра, заслуженная артистка Беларуси Людмила Корхова получила за лучшее исполнение роли в чеховской "Чайке".

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

Загляните

Тропой Креса

Не совсем обычная выставка-проект с таким названием открылась днями в столичной галерее "Шестая линия" (ул. Я.Коласа, 14).

По словам автора и исполнителя проекта Инны Каюта и куратора проекта Ольги Копенкиной, выставка — всего лишь часть проекта, который включает в себя ряд разноструктурных, но одностилевых экспозиций. Центральная часть выставки-проекта — проволочный каркас двойной пирамиды. Обнаженный каркас — плен художника.

"Крес" — старое русское слово, означающее "огонь очищения". В дохристианские времена эта чистка называлась Кресением и производилась Тропой. По сути, Кресение означает науку возрождения. После Кресения появились такие понятия, как "крещение", "воскресение", "крест".

По всей жизни Боги посылают человеку потрясения, дабы оживить вечно озабоченную душу и привести ее в состояние чистоты восприятия. Тогда с этой по-детски открытой, наивной душой начинают разговаривать духи рек, полей, лесов. Они приводят душу в состояние счастья, при котором человек ощущает себя маленькой частью огромного мира, причастным звеном в цепи природных и божественных движений... Задача данной выставки — провести зрителя по пути художника от истоков осознания божественной причастности к рождающимся работам, где основным процессом живописи (живописания) является Открытость.

Как отмечает Ольга Копенкина, коварство авторской концепции заключается в том, что зритель, пришедший на выставку, ожидает увидеть нечто, что потрясет душу. Но зритель теряется во множестве непонятных повторов...

В общем, если Вы так ничего и не поняли, приходите на выставку. Там можно будет пройти по авангардной тропе Креса, подискутировать об истоках творчества и просто насладиться эстетической чистотой, красотой и свободой...

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

Черные страницы

Это было...

Считается, что химическую войну в Ираке развязал Саддам Хуссейн против национального меньшинства — курдов. Однако подобные выверты были отмечены еще в России в 1921 году, когда известный полководец М.Тухачевский применил отравляющие газы против граждан советской России — восставших крестьян (!) Тамбовской губернии, в результате чего село Кипец и другие мирные селения данной губернии были практически уничтожены этим чудовищным химическим оружием...

Александр ШУСТОВСКИЙ.

Борисов.

Анекдотики

— Обвиняемый, что вы сделали с теми двумястами франками, что украли у патрона?

— Я потратил их на Ирму, девчонку из кафе "Стар".

— Обвиняемый, не вводите суд в заблуждение. Ирма никогда не берет больше ста франков.

* * *

Судья:

— Вы совершили восемь ограблений за одну неделю. Разве это возможно?

Подсудимый:

— Работал день и ночь, ваша честь. Если бы все трудились так, как я, наша страна давно уже вышла бы на путь процветания.

* * *

Две секретарши беседуют за чашкой чая.

— Ты знаешь, — говорит одна, — когда шеф спросил, сколько мне лет, я так и не смогла вспомнить, то ли мне двадцать, то ли двадцать один.

— Ну, и что же ты ему сказала?

— Я взяла среднее и сказала, что мне девятнадцать.

* * *

— Мне надо прилично отдохнуть и привести себя в порядок, — объясняет хорошенькая кассирша хозяину бара. — Я явно не в лучшей форме.

Хозяин удивляется:

— Какая чепуха!

— Совсем не чепуха, — вздохнула она, — если мужчины начинают считать сдачу...

* * *

Подъехав к перекрестку на своем "Пежо", Бриджит пропускает зеленый свет светофора, потом красный, снова пропускает зеленый и еще раз красный. К ней подходит полицейский и галантно осведомляется:

— Мадемуазель предпочитает какой-то другой цвет?

* * *

Две секретарши обсуждают своих начальников.

— Мне мой нравится, но, к сожалению, он слишком педантичен.

— В каком смысле?

— Он утверждает, что все слова пишутся строго определенным образом.

* * *

Приезжему требуется жилье.

— Пожалуйста, — говорят ему в квартирном бюро, — хозяйка сдает комнату всего за 500 марок.

— 500 марок?! А если я не б[illegible] пользоваться хозяйкой?..

* * *

Женщина ведет корову по улице маленького городка. Подходит полицейский.

— Вы знаете, что тротуар предназначен только для пешеходов?

— Конечно. А вы что, хотите сказать, что моя корова едет на велосипеде?

ТЕЛЕПРОГРАММА

Четверг, 13 ноября

Белорусское телевидение

07.30 Утренний коктейль.
07.45, 17.55 "Музыкальная обойма".
07.50 Авто-парк.
08.00, 13.00, 15.00, 18.00, 00.20 Новости.
08.10 Вертикаль.
08.35 Мультфильмы.
09.00 "Телебом" на Международном фестивале детского творчества "Мы — XXI век" в Болгарии.
09.30, 17.45 Экономикст.
09.40 "Плененные парусами". Короткометражный фильм.
10.00 Творцы. Поэтесса Валентина Поликанина.
10.35 Гости в дом.
11.10 "Красное и черное". Худ. фильм. 4-я серия.
12.15 Королевская охота.
15.15 "Приключения Мюнхгаузена". Мультфильмы 1—4-й.
16.00 Педагогический экран. Образование в воспитательно-трудовых учреждениях республики (Витебск).
16.30 ТВ — школе. Белорусская литература. 8-й класс. "От имени народа". Франтишек Богушевич и его творчество.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
18.20 "Красное и черное". Худ. фильм. 4-я серия.
19.25 Тема дня.
19.45 Сделано в Беларуси. Гродненское ПО "Азот".
20.00 "АРТ-клуб". Актриса Национального академического театра им. Я.Купалы Е.Кульбачная.
20.30 Музыкальный антракт.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Телебарометр. Прогноз погоды.
22.05 К.Райкин, М.Неелова в худ. фильме "Тень, или Может быть, все обойдется".
23.50 Крок. Программа для молодежи.

ОРТ

08.00, 11.00, 14